**Установа адукацыі**
**«Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Францыска Скарыны»**

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
УА «ГДУ імя Ф. Скарыны»
_____І.В. Семчанка
(подпіс)

_____
(дата зацвярджэння)

Рэгістрацыйны № УД-_____/р.

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)

**Вучэбная праграма па дысцыпліне па выбару для спецыяльнасці 1 – 23 01 04 “Псіхалогія”;**

Факультэт давузаўскай падрыхтоўкі і навучання замежных студэнтаў

Кафедра давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі

Курс 1

Семестр 2

Лекцыі – Экзамен –

Практычныя заняткі 8 гадзін Залік 2 семестр

Усяго аўдыторных гадзін па дысцыпліне 8 гадзін Курсавы праект (работа) –

Усяго гадзін па дысцыпліне 50 гадзін Форма атрымання вышэйшай адукацыі заочная

Складальнік: С.В. Чайкова, дацэнт

2010

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

Вучэбная праграма складзена на аснове тыпавой вучэбнай праграмы, зацверджанай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь 02.09.2008 г. Рэгістрацыйны № ТД-СГ.015/тып.

Разгледжана і рэкамендавана да зацвярджэння ў якасці рабочага варыянта на пасяджэнні кафедры давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі

___ _____2010 г., пратакол № ____

Загадчык кафедры
дацэнт _____В.І. Яцухна

Адобрана і рекамендавана да зацвярджэння Метадычным саветам факультэта давузаўскай падрыхтоўкі і навучання замежных студэнтаў

___ _____2010 г., пратакол № ____

Старшыня, дэкан факультэта
дацэнт _____А.Ф. Васільеў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Беларуская мова з’яўляецца адной з дзвюх дзяржаўных моў у Рэспубліцы Беларусь. Агульнае прызнанне мовы найгалоўнейшым інструментам інфармацыйнага ўздзеяння, асаблівасці моўнай і сацыяльнай сітуацыі ў нашай краіне патрабуюць ад вышэйшай школы падрыхтоўкі не проста спецыяліста, а камунікатыўна развітай асобы, адукаванай білінгвістычна. Такім чынам, ведаць родную мову чалавеку з вышэйшай адукацыяй проста неабходна. Будучыя псіхолагі і сацыяльныя педагогі павінны на дастатковым узроўні наладжваць зносіны на роднай мове, акрамя таго, валодаць прафесійнай лексікай, тэрміналогіяй, умець перакладаць тэксты псіхалагічнага характару з рускай мовы на беларускую і наадварот; без асаблівых цяжкасцей складаць афіцыйна-справавыя паперы, неабходныя ў прафесійнай сферы.

Беларуская мова (прафесійная лексіка) – дысцыпліна, якая дапамагае студэнтам далучыцца да багаццяў нацыянальнай культуры, сфарміраваць камунікатыўна развітую асобу, здольную наладжваць зносіны на роднай мове ў прафесійнай сферы, перакладаць і рэферыраваць прафесійна арыентаваныя і навуковыя тэксты, весці дзелавую дакументацыю, выступаць з навуковымі паведамленнямі і публічнымі прамовамі і інш.

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне па выбару «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» прызначана для ажыццяўлення на першай ступені вышэйшай адукацыі ў межах цыкла сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, а менавіта для спецыяльнасці 1 – 23 01 04 “Псіхалогія”.

Дадзеная вучэбная праграма распрацавана ў адпаведнасці з такімі нарматыўнымі і метадычнымі дакументамі, як:

— Образовательный стандарт «Высшее образование. Первая ступень. Цикл социально-гуманитарных дисциплин» (зацверджаны і ўведзены ў дзеянне пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 01.09.2006 г. № 89);

— Изменение № 1 к РД РБ 02100.5227-2006 (зацверджана і ўведзена ў дзеянне пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 18.01.2008 г. № 3);

— Порядок разработки, утверждения и регистрации учебных программ для первой ступени высшего образования (зацверджаны Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь 28.12.2007 г.).

У вучэбнай праграме ўлічаны патрабаванні адукацыйнага стандарта па цыклу сацыяльна-гуманітарных дысцыплін.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

Праграма курса «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» накіравана на засваенне і прафесійнае прымяненне беларускай навуковай тэрміналогіі, выпрацоўку ў студэнтаў уменняў правільна ўспрымаць любую інфармацыю на беларускай мове, а таксама дакладна і асэнсавана выказваць любую думку, спрыяць павышэнню грамадскага прэстыжу беларускай літаратурнай мовы як мовы тытульнай нацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

Асноўныя мэты выкладання дысцыпліны:

— выпрацаваць і замацаваць практычныя ўменні і навыкі граматнага карыстання вуснай і пісьмовай мовай;

— развіць моўна-эстэтычны густ студэнтаў, звязаны з чысцінёй і правільнасцю мовы;

— пашыраць і ўзбагачаць прафесійны лексічны запас будучых спецыялістаў, выпрацаваць уменне практычнага карыстання тэрміналогіяй і прафесійнай лексікай па абранай спецыяльнасці;

— фарміраваць устаноўкі на практычнае ўкараненне атрыманых студэнтамі ведаў у іх прафесійнай дзейнасці і іншых сферах сацыяльнай актыўнасці;

— выхоўваць любоў і павагу да мастацкага слова, духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа, пачуццё нацыянальнай самапавагі і самаідэнтыфікацыі, імкнення да далейшага ўзбагачэння беларускай мовы.

Задачы вывучэння дысцыпліны:

— сфарміраваць у студэнтаў разуменне неабходнасці ведаць і карыстацца беларускай мовай у прафесійнай дзейнасці;

— даць студэнтам неабходную сістэму ведаў аб лексічным складзе, тэрміналогіі і маўленчай культуры;

— дапамагчы студэнтам усвядоміць месца беларускай мовы ў развіцці культуры і ў духоўным адраджэнні нацыі;

— садзейнічаць падрыхтоўцы высокаадукаваных, творчых і крытычна думаючых спецыялістаў, здольных вырашаць складаныя моўна-сацыяльныя праблемы бытавання беларускай мовы ва ўмовах дзяржаўнага білінгвізму.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен:

***ведаць*:**

— ролю мовы і маўлення ў працэсе сацыяльных зносін;

— функцыі беларускай мовы як асноватворнага кампанента нацыянальнай культуры;

— месца і ролю беларускай мовы ў славянскай і еўрапейскай супольнасці народаў і моў;

— сістэму лексічных, граматычных і стылістычных сродкаў беларускай мовы;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

— поўны набор прафесійнай лексікі;
— тэрміналагічныя слоўнікі і даведнікі па адпаведных сферах навукова-прафесійнай дзейнасці;

***умець:***

— граматна карыстацца вуснай і пісьмовай мовай;
— адэкватна ўспрымаць прафесійныя тэксты і навуковую галіновую інфармацыю;
— перакладаць, анатаваць і рэферыраваць прафесійна арыентаваныя тэксты;
— складаць і весці на беларускай мове дзелавую дакументацыю, рыхтаваць навуковыя і публічныя выступленні і г.д.;
— выконваць тэсты і тэставыя заданні, якія садзейнічаюць замацаванню вучэбнага матэрыялу.

У межах вывучэння дысцыпліны прадугледжаны падрыхтоўка вусных паведамленняў і пісьмовых рэфератаў па вызначанай тэматыцы, знаёмства з навуковай, навукова-папулярнай, хрэстаматыйнай літаратурай, рэферыраванне і анатаванне прафесійна арыентаваных тэкстаў і інш.

Для дыягностыкі кампетэнцый, выяўлення вучэбных дасягненняў студэнтаў на прамежкавым і выніковым этапах выкарыстоўваюцца тэставыя заданні, самастойныя работы, кантрольная работа; залік.

Для паспяховага вывучэння дысцыпліны студэнтам неабходны веды па курсах «Гісторыя Беларусі».

Дысцыпліна па выбару «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» прызначана для студэнтаў 1 курса спецыяльнасці 1 – 23 01 04 “Псіхалогія” завочнаага факультэта і разлічана на 50 вучэбных гадзін, з якіх 8 гадзін аўдыторных практычных заняткаў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Уводзіны ў дысцыпліну «Беларуская мова (прафесійная лексіка)»

Прадмет і задачы курса. Месца курса ў сістэме сацыяльна-гуманітарных навук, яго сувязь з іншымі дысцыплінамі (гісторыяй літаратурнай мовы, лексікалогіяй, стылістыкай і культурай маўлення). Метады навучання. Роля курса ў фарміраванні і развіцці сацыяльна-асобасных і сацыяльна-прафесійных кампетэнцый выпускнікоў ВНУ.

### *Тэма 1* Беларуская мова і яе месца ў сістэме агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей

Мова і соцыум. Функцыі мовы ў грамадстве. Беларуская мова – форма нацыянальнай культуры беларусаў.

Паходжанне беларускай мовы і асноўныя этапы яе развіцця. Старабеларуская літаратурная мова XIV–XVI стст. Дзяржаўны статус беларускай мовы ў Вялікім княстве Літоўскім. Нацыянальна-моўная палітыка Рэчы Паспалітай і яе вынікі. Новая (сучасная) беларуская літаратурная мова XIX–пачатку XX стст. Беларуская мова ў часы Расійскай імперыі ва ўмовах адсутнасці беларускай дзяржаўнасці. Развіццё і функцыянаванне беларускай літаратурнай мовы ў XX–пачатку XXI стст.

### *Тэма 2* Лексічная сістэма беларускай літаратурнай мовы

Лексіка беларускай мовы паводле паходжання (спрадвечна беларуская і запазычаная). Змены ў лексічнай сістэме беларускай мовы: актыўная і пасіўная лексіка. Агульнаўжывальная лексіка і лексіка абмежаванага выкарыстання. Спецыяльная лексіка як частка лексічнай сістэмы сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Адрозненне тэрміналагічнай і прафесійнай лексікі.

Паняцце тэрміна. Слова і словазлучэнне ў ролі тэрміна. Тэрміналогія. Галіновыя тэрміналагічныя сістэмы Узаемасувязь тэрміналагічнай і агульнаўжывальнай лексікі (тэрміналагізацыя і дэтэрміналагізацыя). Асаблівасці словаўтварэння беларускай тэрміналогіі (прадуктыўныя спосабы і сродкі). Тэрміны, запазычаныя з іншых моў, іх асваенне беларускай мовай.

З гісторыі беларускай навуковай тэрміналогіі. Асноўныя прынцыпы яе выпрацоўкі ў 20-30 гг. XX ст. Крыніцы фарміраваннябеларускай тэрміналогіі. Роля жывой народнай мовы ў складванні і развіцці беларускай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

тэрміналагічнай лексікі. Беларуская навуковая тэрміналогія на сучасным этапе.

Тыпы слоўнікаў. Тэрміналагічныя слоўнікі і даведнікі, іх роля і месца ў лексікаграфічнай сістэме беларускай мовы. Сістэма падачы тэрмінаў у тлумачальных і перакладных слоўніках, у слоўніках іншамоўных слоў.

Звесткі з гісторыі беларускай тэрміналагічнай лексікаграфіі. Тэрміналагічная лексікаграфія 20–30-х і 90-х гадоў XX ст.

### *Тэма 3* **Функцыянаванне беларускай мовы ва ўмовах білінгвізму**

Паняцце білінгвізму. Моўная інтэрферэнцыя як вынік білінгвізму. Віды інтэрферэнцыі.

Паняцце моўнай нормы.

Арфаэпічныя нормы беларускай літаратурнай мовы і прычыны іх парушэння. Асаблівасці беларускага літаратурнага вымаўлення ў параўнанні з рускім.

Марфалагічныя нормы беларускай літаратурнай мовы. Назоўнік. Несупадзенне ў родзе, ліку і скланенні. Асаблівасці скланення прозвішчаў, імёнаў і геаграфічных назваў. Прыметнік. Утварэнне і ўжыванне формаў ступеней параўнання якасных прыметнікаў. Выкарыстанне элятыўных формаў у беларускай і рускай мовах. Прыналежныя прыметнікі, іх утварэнне. Займеннік. Асаблівасці ўжывання асабовых, азначальных, адмоўных і няпэўных займеннікаў. Лічэбнік. Скланенне лічэбнікаў і асаблівасці іх ужывання з назоўнікамі. Дзеяслоў. Спецыфіка спражэння. Ужыванне суфіксаў дзеясловаў. Дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе як формы дзеяслова. Асаблівасці іх утварэння і ўжывання ў беларускай мове. Спосабы перадачы дзеепрыметнікаў у складзе тэрміналагічных словазлучэнняў пры перакладзе на беларускую мову. Прыслоўе. Асаблівасці ўтварэння і ўжывання формаў ступеней параўнання ў адрозненне ад рускай мовы.

Сінтаксічныя асаблівасці беларускай літаратурнай мовы. Адрозненні ў будове некаторых словазлучэнняў у беларускай і рускай мовах. Каардынацыя дзейніка і выказніка ў сказе.

### *Тэма 4* **Функцыянальныя стылі маўлення**

Паняцце функцыянальнага стылю. Класіфікацыя функцыянальных стыляў (навуковы, афіцыйна-справавы, публіцыстычны, мастацкі, размоўны).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

Навуковы стыль і яго асноўныя падстылі (уласна навуковы, (акадэмічны), навукова-папулярны, вучэбна-навуковы і інш.). Функцыі навуковага стылю і яго адметныя лексічныя, марфалагічныя і сінтаксічныя асаблівасці.

Афіцыйна-справавы стыль і яго асноўныя падстылі (канцылярскі, юрыдычны, дыпламатычны). Функцыі афіцыйна-справавога стылю і яго характэрныя асаблівасці.

Публіцыстычны стыль і яго асноўныя асаблівасці. Узаемапранікненне стыляў.

## *Тэма 5* **Навуковы стыль**

Асноўныя рысы навуковага стылю (падрыхтаванасць маўлення, пераважна яго пісьмовая форма ў выглядзе маналогу, лагічная паслядоўнасць выказвання, сціслаcць пры інфарматыўнай насычанасці зместу).

Моўныя сродкі навуковага стылю (насычанасць тэрмінамі, перавага абстрактнай лексікі, пераважнае ўжыванне назоўнікаў, пашыранасць формы роднага склону, асаблівая функцыя займенніка *мы*, шырокае выкарыстанне дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў, пашыранасць складаназалежных сказаў з аднароднымі членамі, пабочнымі словамі і ўстаўнымі канструкцыямі, сродкі лагічнай сувязі паміж сказамі і інш.).

Паняцце аб падмове навук: матэматыкі, хіміі, эканомікі, права і г.д. Рэальны слоўнік кожнай падмовы. Выкарыстанне невербальных сродкаў (табліцы, графікі, схемы).

Жанравая разнастайнасць навуковага стылю (артыкул, даклад, рэферат, анатацыя, рэзюме і інш.), агульныя патрабаванні да напісання і афармлення іх.

Кампазіцыя пісьмовага навуковага тэксту і вуснага выступлення, іх афармленне. Рубрыкацыя навуковага тэксту. Абзац як структурная адзінка тэксту. Цытаты і спасылкі, іх афармленне.

Пераклад на беларускую мову навуковых тэкстаў.

## *Тэма 6* **Афіцыйна-справавы стыль**

Асноўныя рысы афіцыйна-справавога стылю (пераважна пісьмовая форма функцыянавання, уніфікаванасць і стандартызаванасць мовы дакументаў, дакладнасць фармулёвак, лагічнасць маўлення, экспрэсіўная нейтральнасць, монасемічнасць лексікі).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Моўныя сродкі афіцыйна-справавога стылю (шырокае выкарыстанне наменклатурных назваў, пашыранасць аддзеяслоўных назоўнікаў, у тым ліку з прэфіксам *не*-, ужыванне назваў асобы паводле сацыяльнага становішча і сферы дзейнасці ў форме мужчынскага роду, абмежаванае выкарыстанне займеннікаў, пашыранасць інфінітыва, спецыфіка дзеяслоўнага кіравання, расшчапленне выказніка, рэгламентацыя парадку слоў у сказе, канструкцыі са складанымі злучнікамі і адыменнымі прыназоўнікамі. Выкарыстанне безасабовых канструкцый).

Віды афіцыйна-справавых тэкстаў (заява, даверанасць, аўтабіяграфія, дакладная запіска, тлумачальная запіска, кантракт, справавыя пісьмы і інш.), правілы іх напісання і афармлення.

Кампазіцыя афіцыйна-справавых тэкстаў. Загаловак і іншыя рэквізіты як элементы тексту службовага дакумента. Роля клішыраваных выразаў у арганізацыі тэксту службовых дакументаў.

Пераклад на беларускую мову афіцыйна-справавых тэкстаў.

## *Тэма 7* **Культура прафесійнага маўлення**

Мова і маўленне. Маўленне – маўленчая дзейнасць – агульная культура чалавека. Прафесійна арыентаванае маўленне.

Паняцце культуры маўлення. Асноўныя камунікатыўныя якасці маўлення: правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, чысціня і багацце (разнастайнасць) маўлення, дарэчнасць, вобразнасць.

Правільнасць маўлення і моўныя нормы (лексічныя, арфаэпічныя, акцэнталагічныя, словаўтваральныя, марфалагічныя, сінтаксічныя). Тыповыя маўленчыя памылкі, іх прычыны, спосабы выпраўлення.

Тэхніка і выразнасць маўлення (голас і маўленчае дыханне, дыкцыя, інтанацыя і інш.).

Узаемадзеянне вербальных і невербальных (жэсты, міміка, рухі) сродкаў маўленчай дзейнасці.

Падрыхтоўка да публічнага выступлення. Асноўныя якасці-паказчыкі паспяховага выступлення. Маўленчы этыкет і культура зносін.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

*Прыкладны пералік практычных заняткаў*

1 Тэрміналагічная, ці прафесійная, лексіка псіхолага.

2 Арганізацыя некаторых навуковых тэкстаў псіхолага.

3 Арганізацыя некаторых афіцыйна-справавых дакументаў псіхолага.

4 Культура маўлення псіхолага.

*Рэкамендуемыя формы кантроля*

1 Самастойныя работы.
2 Пераклады з рускай мовы на беларускую.
3 Рэферыраванне прафесійна арыентаваных тэкстаў.
4 Залік.

*Рэкамендуемыя тэмы самастойных работ*

1 Самастойная работа №1 “Характарыстыка псіхалагічных і педагагічных тэрмінаў”.
2 Самастойная работа №2 “Напісанне псіхолага-педагагічнай характарыстыкі асобы і групы”.

*Рэкамендуемыя пераклады*

1 Пераклад на беларускую мову навуковага тэксту псіхалагічнага/педагагічнага характару.

*Рэкамендуемыя работы для рэферыравання*

1 Артыкул Л.С. Выгоцкага “Мысленне і маўленне”.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

*Рэкамендуемая літаратура*

**Асноўная**


1 Абабурка, М. В. Культура беларускай мовы/ М. В. Абабурка. – Мінск, 1994.
2 Азарка, В. У. Беларуская мова: Спецыяльная лексіка/ В. У. Азарка, А. С. Васілеўская, М. М. Круталевіч. – Мінск, 2004.
3 Антанюк, Л. А. Беларуская навуковая тэрміналогія: фарміраванне, структура, упарадкаванне, канструяванне, функцыяніраванне/ Л. А. Антанюк. – Мінск, 1987.
4 Антанюк, Л. А. Беларуская мова: спецыяльная лексіка/ Л. А. Антанюк, Б. А. Плотнікаў.– Мінск, 2004.
5 Арашонкава Г. У. Тэорыя і практыка беларускай тэрміналогіі/ Г. У. Арашонкава [і інш.]. – Мінск, 1999.
6 Асновы культуры маўлення і стылістыкі / пад рэд. У. В. Анічэнкі. – Мінск, 1992.
7 Бадзевіч З. І. Курс беларускай мовы/ З. І. Бадзевіч, Л. І. Сямешка, І. Р. Шкраба. – Мінск, 1996.
8 Браим, И. Культура делового общения/ И. Браим. – Минск, 1998.
9 Каляда, А. Беларускае літаратурнае вымаўленне: практыкум па дыкцыі і арфаэпіі/ А. Каляда. – Мінск, 2006.
10 Каўрус, А. А. Стылістыка беларускай мовы / А. А. Каўрус. – Мінск, 1992.
11 Каўрус, А. Дакумент па-беларуску/ А. Каўрус. – Мінск, 1994.
12 Кривицкий, А. А. Белорусский язык для говорящих по-русски / А. А. Кривицкий, А. Е. Михневич, А.И. Подлужный. – Минск, 1992.
13 Ляшчынская, В. А. Беларуская мова. Тэрміналагічная лексіка: вучэбны дапаможнік/ В. А. Ляшчынская. – Мінск, 2001.
14 Ляшчынская, В. А. Студэнту аб мове: прафесійная лексіка/ В. А. Ляшчынская. – Мінск, 2003.
15 Плотнікаў, Б.А. Кароткая гісторыя беларускай мовы і мовазнаўства / Б.А. Плотнікаў. – Мінск, 2002.
16 Падлужны, А. І. Мова і грамадства / А. І. Падлужны. – Мінск, 1997.
17 Пытанні культуры пісьмовай мовы / пад рэд. А. І. Падлужнага. – Мінск, 1991.
18 Старавойтава, Н. П. Беларуская мова: гісторыя і сучаснасць: вучэбна-метадычны дапаможнік для нефілалагічных спецыяльнасцей/ Н. П. Старавойтава. – Мінск, 2006.
19 Тэорыя і практыка беларускай тэрміналогіі. – Мінск, 1999.
20 Цікоцкі, М. Я. Стылістыка беларускай мовы/ М. Я. Цікоцкі. – Мінск, 1995.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

21 Шакун, Л. М. Гісторыя беларускага мовазнаўства : вуч. дапаможнік / Л. М. Шакун. – Мінск, 1995.
22 Юрэвіч, А. К. Стылістыка беларускай мовы : вуч. дапаможнік / А. К. Юрэвіч. – Мінск, 1992.

**Дадатковая**

23 Анічэнка, У.В. Нацыянальная і інтэрнацыянальная тэрміналогія беларускай мовы / У.В.Анічэнка // Перспектывы развіцця нарматыўнай лексікі [арт. і мат. навук.-метад. канф.]. – Гомель, 1998.
24 Антанюк, Л. А. Беларуская навуковая тэрміналогія : фарміраванне, структура, упарадкаванне, канструяванне, функцыяніраванне / Л. А Антанюк. – Мінск, 1997.
25 Антанюк, Л. А. Развіццё і задачы ўпарадкавання беларускай навуковай тэрміналогіі/ Л. А. Антанюк // Тэрміналагічны зборнік «83». – Мінск, 1985. – С. 5-17. 20.
26 Беларуская мова : як пазбегнуць памылак руска-беларускай моўнай інтэрферэнцыі / склад. А. І. Малько, ІІ. І. Малько. – Горкі, 1999.
27 Бідэр, Г. Развіццё беларускай літаратурнай мовы ў кантэксце славянскага адраджэння. Беларусь паміж Усходам і Захадам / Г. Бідэр – Мінск, 1997.
28 Бяляўскі, С.С. Шляхі развіцця беларускай тэрміналагічнай лексікі / С.С. Бяляўскі [і інш.] // Перспектывы развіцця нарматыўнай лексікі [арт. і мат. навук.-метад. канф.]. – Гомель, 1998.
29 Гарэцкі, Р. Беларуская навуковая тэрміналогія — важны кірунак нацыянальнага адраджэння / Р. Гарэцкі. – Мінск, 1995.
30 Дьячков, М. В. Проблемы двуязычия (многоязычия) и образования / М. В. Дьячков. – Москва, 1991.
31 Кавалёва, М. Ц. Беларуская мова: дапаможнік для вучняў старэйшых класаў/ М. Ц. Кавалёва. – Мінск, 1995.
32 Капейко, Т. В. Лексіка-семантычны спосаб тэрмінаўтварэння/ Т. В. Капейко. – Магілёў, 2007.
33 Красней, В. П. Навуковы стыль сучаснай беларускай літаратурнай мовы/ В. П. Красней // Беларуская мова ў другой палове XX ст.: матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі. – Мінск, 1998. – С. 16–19.
34 Куліковіч, У. І. Беларускі правапіс: правілы, заданні, кантрольныя работы/ У. І. Куліковіч. – Мінск, 1998.
35 Лаўрэй, Я. Мова — найважнейшы сродак зносін / Я. Лаўрэй // Роднае слова. – 1996. – №3.
36 Лексікалогія сучаснай беларускай літаратурнай мовы / пад рэд. А. Я. Баханькова. – Мінск, 1994.
37 Мартынаў, В. У мовы роднай — моцнае карэнне : беларуская мова сярод іншых славянскіх моў / В. Мартынаў // Роднае слова. – 1993. – № №1-2.
38 Міхневіч, А. "Чалавек, які гаворыць" / А. Міхневіч // Роднае слова. – 1996. – №9.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

39 Праблемы беларускай навуковай тэрміналогіі: матэрыялы 1-й нацыянальнай канферэнцыі. – Мінск, 1995.
40 Практыкум па беларускай мове / пад рэд. Г. М. Малажай. – Мінск, 2005.
41 Прыгодзіч, М. Р. Шчодрасць слова/ М. Р. Прыгодзіч. – Мінск, 1990.
42 Пытанні нармалізацыі беларускай навуковай тэрміналогіі: матэрыялы рэспубліканскай навуковай канферэнцыі. – Гомель, 1994.
43 Станкевіч, А. А. Дэтэрміналагізацыя тэрмінаў іншамоўнага паходжання ў сучаснай беларускай мове/ А. А. Станкевіч // Беларуская мова. – 1997.- Вып. 5. – С. 27 –34.
44 Станкевіч, С. Русіфікацыя беларускай мовы ў БССР / С. Станкевіч. – Мінск, 1994.
45 Старычонак, В. Д. Займальная філалогія/ В. Д. Старычонак. – Мінск, 1998.
46 Сучасная беларуская літаратурная мова: марфалогія / пад рэд. М. С. Яўневіча. – Мінск, 1997.
47 Цыхун, Г. Беларуская мова і моўная экалогія / Г. Цыхун // Полымя. – 1994. – №11.
48 Шакун, Л. Карані нашай мовы / Л. Шакун // Роднае слова. – 1996. – №9.
49 Шчэрбін, В. Факты і міфы : рэформа беларускага правапісу 1933 года / В. Шчэрбін // Роднае слова. – 1989. – №9.
50 Яновіч, А. Беларуская граматыка Б. Тарашкевіча / А. Яновіч // Роднае слова. – 1990. – №9.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

## Слоўнікі


1 Арашонкава, Г. У. Кароткі слоўнік беларускай мовы. Правапіс. Вымаўленне. Націск. Словазмяненне. Словаўжыванне/ Г. У. Арашонкава, В. П. Лемцюгова. – Мінск, 1994.
2 Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Мінск, 1996 – 2004.
3 Булыка, А. М. Слоўнік іншамоўных слоў: у 2 т./ А. М. Булыка. – Мінск, 1999.
4 Мысліцелі і асветнікі Беларусі: энцыклапедычны даведнік / Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1995.
5 Руска-беларускі слоўнік: у 3 т. – Мінск, 1995.
6 Слоўнік беларускай мовы. Арфаграфія. Арфаэпія. Акцэнтуацыя. Словазмяненне / пад рэд. М. В. Бірылы. – Мінск, 1987.
7 Социологическая энциклопедия / под. общ. ред. А. Н. Данилова. – Минск, 2003.
8 Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5 т. – Мінск, 1977 – 1984.
9 Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы. – Мінск, 2005.
10 Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. – Мінск, 1984 – 1987.


***


1 Алоўнікава, Н. Г. Руска-беларуска-англійскі слоўнік па педагогіцы і псіхалогіі / Н. Г. Алоўнікава, В. В. Кандрацьева; Беларус. дзярж. пед. ун-т. – Мінск, 1996.
2 Кароткі слоўнік псіхалагічных паняццяў /Мазыр. дзярж. пед. ін-т; склад.: Н. П. Бярнацкая [і інш.]; пад агул. рэд. П. П. Шумскага. – Мазыр, 1993.
3 Кароткі тлумачальны слоўнік педагагічных тэрмінаў /Беларус. дзярж. пед. ун-т; уклад.: А. І. Андарала, Г. Ф. Андарала. – Мінск, 1995.
4 Кацэвіч, С. С. Слоўнік педагагічных тэрмінаў/ С. С. Кацэвіч. – Брэст, 1995.
5 Краткий русско-белорусский дефектологический словарь / Респ. ин-т усов. учит.; сост.: Т. В. Лещинская, В. В. Лепешкин, В. А. Янковский. – Минск, 1991.
6 Руска-беларускі слоўнік па псіхалогіі /Мін. дзярж. пед. ін-т; склад.: Т. У. Васілец, Я. Л. Каламінскі, Р. А. Макарэвіч. – Мінск, 1991.
7 Руска-беларускі слоўнік педагагічных тэрмінаў /Мін. дзярж. пед. ін-т; склад.: М. А. Ярмаловіч, І. І. Кабіціна. – Мінск, 1992.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

8 Русско-белорусский словарь делопроизводственной и архивной терминологии / сост. В. А. Сорока [и др.]. – Минск, 1997.
9 Слоўнік педагагічных тэрмінаў /Брэсц. дзярж. пед. ін-т; склад. С. С. Кацэвіч; рэд. В. М. Емельяновіч. – Брэст, 1993.
10 Чэчат, В. У. Кароткі руска-беларускі педагагічны слоўнік/ В. У. Чэчат, В. В. Чэчат, Р. Р. Чэчат; Нац. ін-т адукацыі. –Мінск, 1996.

*Рэкамендуемыя пытанні да заліку*

1 Мова і соцыум
2 Функцыі мовы ў грамадстве.
3 Асноўныя этапы развіцця беларускай мовы.
4 Месца беларускай мовы сярод іншых славянскіх моў.
5 Беларуская мова – форма нацыянальнай культуры беларусаў.
6 Паняцце і аспекты беларуска-рускага білінгвізму.
7 Моўныя нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы.
8 Правільнасць маўлення.
9 Лексіка беларускай мовы паводле паходжання.
10 Класіфікацыя функцыянальных стыляў.
11 Маўленне і маўленчая дзейнасць.
12 Камунікатыўныя якасці маўлення.
13 Культура маўлення публічнага выступлення.
14 Культура маўлення псіхолага.
15 Афіцыйна-справавыя дакументы і асаблівасці іх афармлення.
16 Жанры навуковых тэкстаў: анатацыя, рэзюмэ, рэферат, тэзісы, артыкул.
17 Сучасная тэрміналогія псіхолага.
18 Паходжанне псіхалагічных і педагагічных тэрмінаў.
19 Утварэнне псіхалагічных і педагагічных тэрмінаў.
20 Лексіка-граматычная-характарыстыка псіхалагічных і педагагічных тэрмінаў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТКА

| Нумар раздзела, тэмы, заняткаў | Назва раздзела, тэмы, заняткаў; пералік вывучаемых пытанняў | Усяго гадзін | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | Матэрыяльнае забеспячэнне заняткаў (наглядныя, методические пособия и др.) | Літаратура | Формы кантролю ведаўз |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | лекцыі | практычныя заняткі (семінарскія) занятия | лабараторныя заняткі | СКРС | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| **1** | **Раздзел 1 Беларуская мова і яе месца ў сістэме агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей** | - | - | - | - | - | | | |
| **1.1** | **Мова і соцыум**<br>1 Уводзіны ў дысцыпліну “Беларуская мова (прафесійная лексіка)”.<br>2 Паняцце мовы і гіпотэзы яе паходжання.<br>3 Мова і соцыум.<br>4 Функцыі мовы ў грамадстве. | - | - | - | - | - | | [12]<br>[14]<br>[16]<br>[35]<br>[38] | **Самастойнае вывучэнне** |
| **1.2** | **Паходжанне беларускай мовы і асноўныя этапы яе развіцця**<br>1 Старабеларуская літаратурная мова XV-XVI стст.<br>2 Роля Францыска Скарыны і яго прадаўжальнікаў у развіцці беларускай мовы.<br>3 Новая (сучасная) беларуская літаратурная мова XIX-пачатку XX стст.<br>4 Развіццё і функцыянаванне беларускай літаратурнай мовы ў XX-пачатку XXI стст. | - | - | - | - | -- | | [15]<br>[16]<br>[21]<br>[44]<br>[48]<br>[49]<br>[50] | **Самастойнае вывучэнне** |
| **1.3** | **Беларуская мова – форма нацыянальнай культуры беларусаў.** | - | - | - | - | - | | [15] | **Самастойнае вывучэнне** |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 Месца беларускай мовы сярод іншых славянскіх і неславянскіх моў.<br>2 Формы беларускай літаратурнай мовы.<br>3 Разнавіднасці беларускай мовы.<br>4 Нацыянальная мова і духоўная культура народа. | | | | | | | [16]<br>[27]<br>[37]<br>[41] | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| **2** | **Раздзел 2 Лексічная сістэма беларускай літаратурнай мовы** | **2** | **-** | **2** | **-** | **-** | | | |
| **2.1** | **Лексіка беларускай мовы**<br>1 Лексіка беларускай мовы паводле паходжання.<br>2 Актыўная і пасіўная лексіка.<br>3 Агульнаўжывальная лексіка і лексіка абмежаванага выкарыстання.<br>4 Спецыяльная лексіка як частка лексічнай сістэмы сучаснай беларускай літаратурнай мовы. | **-** | **-** | **-** | **-** | **-** | | [2]<br>[4]<br>[7]<br>[12]<br>[15]<br>[31]<br>[36] | **Самастойнае вывучэнне** |
| **2.2** | **Тэрміналогія беларускай мовы**<br>1 Паняці “тэрмін”, “тэрміналогія”, тэрмасістэма”, “прафесіяналізм”, “прафесійная лексіка”.<br>2 Асаблівасці словаўтварэння беларускай тэрміналогіі.<br>3 З гісторыі беларускай навуковай тэрміналогіі.<br>4 Сучасны стан развіцця беларускай тэрміналогіі. | **-** | **-** | **-** | **-** | **-** | | [3]<br>[5]<br>[19]<br>[25]<br>[28]<br>[29]<br>[43] | **Самастойнае вывучэнне** |
| **2.3** | **Тэрміналагічная, ці прафесійная, лексіка псіхолага**<br>1 Асаблівасці псіхалагічных і педагагічных тэрмінаў.<br>2 Паходжанне псіхалагічных і педагагічных тэрмінаў<br>3 Утварэнне псіхалагічных і педагагічных тэрмінаў.<br>4 Лексіка-граматычная-характарыстыка псіхалагічных і педагагічных тэрмінаў. | **2** | **-** | **2** | **-** | **-** | | [13]<br>[14]<br>[23]<br>[24]<br>[32]<br>[39]<br>[42] | **Самастойная работа** |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **3** | Раздзел 3 **Функцыянаванне беларускай мовы ва ўмовах білінгвізму** | - | - | - | - | - | | | |
| **3.1** | **Моўная інтэрферэнцыя і моўныя нормы**<br>1 Моўная інтэрферэнцыя як вынік білінгвізму.<br>2 Арфаэпічныя і акцэнталагічныя нормы беларускай літаратурнай мовы.<br>3 Арфаграфічныя нормы беларускай літаратурнай мовы.<br>4 Словаўтваральныя нормы беларускай літаратурнай мовы. | - | - | - | - | - | | [9]<br>[12]<br>[26]<br>[30]<br>[34]<br>[40] | **Самастойнае вывучэнне** |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| **3.2** | **Граматычныя нормы беларускай літаратурнай мовы**<br>1 Марфалагічныя нормы беларускай літаратурнай мовы.<br>2 Сінтаксічныя асаблівасці беларускай мовы. | - | - | - | - | - | | [7]<br>[31]<br>[40]<br>[46] | **Самастойнае вывучэнне** |
| **4** | **Раздзел 4 Фунцыянальныя стылі маўлення** | **4** | - | **4** | - | - | | | |
| **4.1** | **Класіфікацыя функцыянальных стыляў**<br>1 Паняцце функцыянальнага стылю.<br>2 Навуковы стыль: яго падстылі, функцыі, адметныя асаблівасці.<br>3 Афіцыйна-справавы стыль: яго падстылі, функцыі, характэрныя асаблівасці.<br>4 Публіцыстычны стыль і яго асноўныя асаблівасці. | - | - | - | - | - | | [10]<br>[17]<br>[20]<br>[22] | **Самастойнае вывучэнне** |
| **4.2** | **Навуковы стыль**<br>1 Моўныя сродкі навуковага стылю.<br>2 Жанравая разнавіднасць навуковага стылю.<br>3 Кампазіцыя пісьмовага навуковага тэксту і вуснага выступлення, іх афармленне.<br>4 Асаблівасці перакладу на беларускую мову | - | - | - | - | - | | [10]<br>[17]<br>[20]<br>[22]<br>[33] | **Самастойнае вывучэнне** |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | навуковых тэкстаў. | | | | | | | | |
| **4. 3** | **Арганізацыя некаторых навуковых тэкстаў**<br>1 Анатацыя і рэзюмэ як жанры навуковага стылю.<br>2 Афармленне рэфератаў.<br>3 Афармленне тэзісаў і артыкулаў.<br>4 Афармленне курсавых і дыпломных работ. | **2** | | **2** | **-** | | | [10]<br>[17]<br>[20]<br>[22] | **Рэферыраванне** |
| **4.4** | **Афіцыйна-справавы стыль**<br>2 Моўныя сродкі афіцыйна-справавога стылю.<br>3 Віды афіцыйна-справавых тэкстаў.<br>4 Кампазіцыя афіцыйна-справавых тэкстаў.<br>5 Пераклад на беларускую мову афіцыйна-справавых тэкстаў. | **-** | **-** | **-** | **-** | **-** | | [11]<br>[17]<br>[20]<br>[22] | **Самастойнае вывучэнне** |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| **4.5** | **Арганізацыя некаторых афіцыйна-справавых дакументаў**<br>1 Правілы справавой перапіскі.<br>2 Правілы напісання заяў, аб'яў.<br>3 Прыкладная схема псіхолага-педагагічнай характарыстыкі асобы і групы.<br>4 Правілы афармлення некаторых справавых папер псіхолага і педагога. | **2** | **-** | **2** | **-** | **-** | | [8]<br>[11<br>[13]<br>[14] | **Самастойная работа** |
| **5** | **Раздзел 5 Культура прафесійнага маўлення** | **2** | **-** | **2** | **-** | **-** | | | |
| **5.1** | **Маўленне і маўленчая дзейнасць**<br>1 Маўленне – маўленчая дзейнасць – агульная культура чалавека.<br>2 Узаемадзеянне вербальных і невербальных сродкаў маўлення.<br>3 Прафесійна арыентаванае маўленне. | **-** | **-** | **-** | **-** | **-** | | [1]<br>[6]<br>[10]<br>[17] | **Самастойнае вывучэнне** |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ. Ф. СКОРИНЫ

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **5.2** | **Камунікатыўныя якасці маўлення**<br>1 Дакладнасць і лагічнасць маўлення.<br>2 Чысціня і багацце (разнастайнасць) маўлення.<br>3 Дарэчнасць маўлення.<br>4 Вобразнасць маўлення. | **-** | **-** | **-** | **-** | **-** | | [1]<br>[6]<br>[20]<br>[22] | **Самастойнае вывучэнне** |
| **5.3** | **Культура маўлення публічнага выступлення**<br>1 Падрыхтоўка да публічнага выступлення.<br>2 Кампазіцыя публічнага выступлення<br>3 Асноўныя якасці-паказчыкі паспяховага выступлення. | **-** | **-** | **-** | **-** | | | [1]<br>[6]<br>[17] | **Самастойнае вывучэнне** |
| **5.4** | **Культура маўлення псіхолага і педагога**<br>1 Тэхніка маўлення.<br>2 Выразнасць маўлення.<br>3 Маўленчы этыкет і культура зносін. | **2** | **-** | **2** | **-** | **-** | | [1]<br>[6]<br>[17] | **Самастойнае вывучэнне** |
| | **УСЯГО гадзін** | **8** | **-** | **8** | **-** | **-** | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМ.Ф.СКОРИНЫ